УДК 001.32(476)+303.446.2:[008(476)+008(4-11)]+929:008(476)"19/20 Дарашэвіч Э.К.

*В. В. Калацэй*

# Культурна-антрапалагічны аналіз усходнееўрапейскай культуры ў працах выдатнага беларускага даследчыка Э. К. Дарашэвіча

*У артыкуле разгледжаны шэраг культуралагічных выданняў, падрыхтаваных з удзелам прафесара Энгельса Дарашэвіча. Беларуская школа гісторыка-філасофскіх даследаванняў фактычна пазначыла гэтымі выданнямі некалькі напрамкаў навуковага пошуку, якія ствараюць перадумовы для комплекснага антрапалагічнага аналізу генезісу і тыпалогіі беларускай і ўсходнееўрапейскай культуры.*

Літаратура па культурнай антрапалогіі пачала друкавацца ў Беларусі ў 1990-я гг., у шэрагу ўстаноў вышэйшай адукацыі (у тым ліку і ў БДУКМ) распрацаваны адпаведныя курсы, метадычныя дапаможнікі. Магчыма, пачатак скіраванасці на культурную антрапалогію, які сёння назіраецца сярод акадэмічных колаў, здолее не толькі ўдасканаліць навучальны працэс і больш рупліва карыстацца бюджэтнымі сродкамі, выдзеленымі на вышэйшую адукацыю, але і выратаваць айчынныя фалькларыстыку і этнаграфію ад крызісу, у які яны трапілі ў канцы 1980-х гг.

Найбольш сенсітыўныя даследчыкі заўсёды адчувалі неабходнасць комплекснага вывучэння культуры, яе велізарную ролю ў структуры сучаснага грамадства [3]. Сярод іх Энгельс Дарашэвіч – адзін з заснавальнікаў беларускай культуралогіі, сацыёлаг культуры, гісторык філасофіі і педагогікі [1], педагог і даследчык нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі (мал. 2), якога заўсёды хвалявала праблема тыпалогіі і распрацоўкі тэзаўруса культуры Беларусі. Пачатак навуковай кар'еры Э. К. Дарашэвіча прыпадае на часы «адлігі» 1960-х гг., пасля была цікавая праца ў акадэмічных навукова-даследчых установах, паспяховая педагагічная дзейнасць. Сёння Энгельса Дарашэвіча лічаць найстарэйшым прадстаўніком айчыннай школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў, да якой таксама адносяць Сямёна Падокшына, Уладзіміра Конана [7] і Альфрэда Майхровіча і інш. У значнай ступені намаганнямі гэтых даследчыкаў (і іх паслядоўнікаў) беларуская гуманітарыстыка пазбавілася так званага ідэалагічнага прэсінгу і правінцыяналізму, што ўнесла шмат карыснага ў культурнае і грамадскае жыццё нашай краіны, стварыла перадумовы для больш дакладнага самавызначэння і ідэнтыфікацыі беларусаў. Так склалася, што беларуская школа гісторыка-філасофскіх даследаванняў, у якіх выдатную ролю адыгрывае Энгельс Дарашэвіч, прааналізавала некалькі вектараў, якія ствараюць перадумовы для комплекснага антрапалагічнага аналізу генезісу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і тыпалогіі не толькі беларускай, але і ўсходнееўрапейскай культуры. Гэтыя вектары, спасылаючыся на публікацыі, дзе яны прадстаўлены эксплiцытна (адкрыта) ці імпліцытна (схавана), можна абазначыць наступным чынам:

– тыпалогія культуры ў яе гістарычных помніках [5];

– тыпалогія і генезіс культуры з выхадам на яе да- і протагістарычныя крыніцы [8];

– пошук структурных і этнаэкалагічных складальнікаў і сістэм, якія забяспечваюць трансляцыю традыцыйнай культуры як «тыпалагічнага ядра» культуры наогул [10; 4].

Бліскучым вынікам суменай працы Э. К. Дарашэвіча з філосафам і эстэтыкам У. Конанам стаў «Очерк…» (мал. 1), які даў эпічную тысячагадовую панараму станаўлення айчыннай культуры ад хрысціянізацыі першых княстваў беларусаў да XX ст. [5], акрэсліў яе тыпалогію і перыядызацыю, адлюстраваную ў пісьмовых крыніцах (у адпаведнасці з першым вектарам комплекснага антрапалагічнага аналізу тыпалогіі культуры). Дарэчы, і дагэтуль гэта кніга з'яўляецца прыкладам таленавітага кампактнага і гіперінфарматыўнага даследавання ўсіх найбольш вядомых гістарычных пісьмовых крыніц і артэфактаў культуры пэўнага народа ў межах аднаго выдання. Фактычна, дзякуючы ёй, айчынная культура гістарычнага часу была ўведзена ў шырокі ўсходнееўрапейскі, агульнаславянскі і нават у еўразійскі навуковы абарот. Варта адзначыць, многія выданні з удзелам Э. К. Дарашэвіча, прысвечаныя гісторыі айчыннай педагагічнай думкі (мал. 2), персаналіям і заканамернасцям развіцця культуры ў эпоху Асветніцтва на беларускіх землях, узбагацілі беларускую навуку, пашырылі яе магчымасці. Сёння даследаванні ў галіне беларускай культуры ажыццяўляюцца на еўрапейскім узроўні і займаюць годнае месца сярод даследаванняў іншых нацыянальных культур.

Магчыма, пошук генезісу айчыннага культурна-гістарычнага матэрыялу (на прыкладах прыгожага пісьменства, выяўленчага мастацтва і архітэктуры, педагогікі, грамадскай думкі і г. д.), апісанага і прааналізаванага ў «Очерке…» (у найбольш глыбокіх гістарычных адрасацыях, прысвечаных выключна славянскаму перыяду старажытнай гісторыі Беларусі), падштурхнуў Э. Дарашэвіча звярнуцца да міжкультурных даследаванняў і супрацоўніцтва з даследчыкамі міфалогіі, мастацкай архаікі, культуры архаічнага светапогляду і паводзін, структуралістамі [6], аналітыкамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, што паглыбіла яго навуковыя інтарэсы да балтыйскага і даіндаеўрапейскага перыядаў старажытнай гісторыі Беларусі ў «Культурнай спадчыне» (мал. 3). Парафраз Р. Генона «...шмат з таго, што еўрапейцы чакаюць ад будучыні, насамрэч знаходзіцца ў іх мінулым» [2], – атрымаў у выданні, задуманым і рупліва складзеным Э. К. Дарашэвічам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новае пераасэнсаванне. У калектыўнай манаграфіі, прысвечанай структурнаму аналізу міфалогіі і светапоглядных вытокаў беларускай традыцыі, культурна-антрапалагічнаму аналізу яе паводзінных стандартаў [8, с. 36–47], адлюстраваны шлях да сістэмнага аналізу генезісу і тыпалогіі культуры беларускіх тэрыторый з выхадам на яе да- і протагістарычнае паходжанне і тыпалагічныя асновы (у адпаведнасці з другім вектарам комплекснага антрапалагічнага аналізу тыпалогіі культуры). У манаграфіі былі акрэслены наступныя напрамкі даследаванняў у галіне культурнай спадчыны: метадалогія сучаснага культуразнаўства (Э. Дарашэвіч «Культурная спадчына структуры культуры» [8, с. 8–10]; структуралізм [6]; постмадэрнісцкія падыходы да айчыннай культуры (А. Сцяпанава «Рысы еўрапейскага постмадэрнізму ў творах Уладзіміра Караткевіча (на матэрыяле рамана "Хрыстос прызямліўся ў Гародні"») [8, с. 102–105]; аксіялогія (А. Вардамацкі «Каштоўнасныя арыентацыі асобы ў жыцці і культуры» [8, с. 120–133]); міжнацыянальны дыялог у культурах (Э. Дарашэвіч, А. Істомін «Культура, нацыянальная свядомасць і міжнацыянальныя дачыненні» [8, с. 106–119]). Выказаныя ў манаграфіі канцэпцыі, ідэі і гіпотэзы значна пашырылі храналагічныя межы беларусазнаўства, уключылі ў яго арбіту перыяд, які папярэднічаў славянскім міграцыям, сінхранізавалі дасягненні беларусазнаўства з балтазнаўствам, індаеўрапеістыкай і палеакультуралагічнымі даследаваннямі [8]. Натуральна, такія параўнанні і даследаванні айчыннай культуры магчымыя выключна ў шырокай усходнееўрапейскай ці цэнтральна- і ўсходнееўрапейскай перспектыве.



Мал. 1. Сумеснае выданне з У. Конанам



Мал. 2. Выданне па гісторыі педагогікі


Мал. 3. Выданне па культуралогіі



Мал. 4. Выданне па фалькларыстыцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калектыўная манаграфія «У тэзаўрусе Беларусі» [10], якая канцэптуальна працягвае традыцыі айчыннай школы гісторыка-філасофскіх даследаванняў, з'явілася, па сутнасці, своеасаблівай данінай павагі і ўдзячнасці прафесару Э. К. Дарашэвічу ад сяброў, калег і студэнтаў. Сам пералік суаўтараў кнігі і іх знакавыя цытаты сведчаць пра пашыранае кола яго навуковых інтарэсаў. Філолаг і эстэтык прафесар Аляксей Рагуля параўноўвае напрамак даследаванняў Энгельса Дарашэвіча «з паказам тварэння Ідэі сучасным беларускім этнасам» [10, с. 82]. Спецыяліст па фарсі і ўсходніх культурах прафесар Каталіцкага ўніверсітэта Амерыкі Сяргей Грэцкі ўхваляе напрамак даследаванняў Дарашэвіча і адзначае яго «энцыклапедычныя веды беларускай, славянскай і еўрапейскай гісторыі, літаратуры, культуры, філасофіі і ўсходняй філасофіі і культуры» [10, с. 103]. Кібернетык Леанід Пешэс адзначае, што Дарашэвіч адзін з першых «ацаніў, наколькі перспектыўны працэс збліжэння кібернетыкі і гуманітарных навук, а таксама значнасць распрацоўкі філасофскіх праблем кібернетыкі» [10, с. 89]. Філолагі і фалькларысты-беларусазнаўцы Рыма Кавалёва, Таццяна Лук'янава, Вольга Прыемка, Таццяна Марозава адзначаюць той знакавы факт у творчасці Энгельса Канстанцінавіча, што «філосаф-спецыяліст у галіне культуралогіі звярнуўся да тэарэтычных праблем вуснай народнай творчасці» [10, с. 105]. Даследчык міфалогіі «адвечнага звароту» Павел Мартысюк сведчыць, што, сапраўды, толькі «міф дае чалавеку магчымасць выйсці за рамкі сваёй часавай абмежаванасці» [10, с. 96]. Культуролаг Яўген Руцкі сцвярджае, што ў разуменні Энгельса Дарашэвіча «ўсе парадыгмы і канцэпцыі… пераасэнсоўваліся як акты тварэння, выкліканыя наступствамі чалавечай фантазіі» [10, с. 115]. У XXI ст. пошук структурных і этнаэкалагічных складальнікаў і сістэм, якія забяспечваюць трансляцыю традыцыйнай культуры (як «тыпалагічнага ядра» культуры наогул), быў ужо надзвычай актуальным, што моцна адчувалася ў «Тэзаўрусе…». Ёсць усе падставы меркаваць, што ў гэтым выданні трэці вектар комплекснага антрапалагічнага аналізу тыпалогіі культуры абазначыў перадумовы для аналізу генезісу і тыпалогіі не толькі беларускай, але і ўсходнееўрапейскай культуры. Больш грунтоўна трэці вектар быў пададзены Э. Дарашэвічам ў «Тэорыі фальклору» (мал. 4), над якой прафесар працаваў у 2009–2015 гг. Кніга адметная і метадалагічным талентам вучонага Э. К. Дарашэвіча, здольнасцю да дакладных навуковых азначэнняў і сістэматызацый, шырокім гуманістычным падыходам да культуры, прыкладамі з культурнай спадчыны беларусаў і абагульненнямі. Добрую глебу для стварэння гэтай кнігі дало супрацоўніцтва Э. Дарашэвіча з «легендай» беларускай аўдыявізуальнай антрапалогіі Зінаідай Мажэйкай (яе лічаць прадстаўніцай сацыяльна-антрапалагічнай школы Ленарта Мэры ў сусветнай этнакінематаграфіі), якая заклікала беларускіх фалькларыстаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і даследчыкаў традыцыйнай культуры да выкарыстання методыкі «ўключанага назірання» культурных антраполагаў яшчэ ў 1980-я гг. [9, с. 10].

Важна адзначыць, што матэрыял, выкарыстаны Э. К. Дарашэвічам у «Тэорыі…», выводзіць чытача на сусветны кантэкст айчыннай традыцыйнай культуры як «тыпалагічнага ядра» нацыянальнай культуры наогул. У кнізе разглядаюцца розныя аспекты фальклору, у тым ліку погляды апошняга канцлера Вялікага Княства Літоўскага І. Храптовіча, палеалінгвіста І. Жарданіі, структураліста К. Леві-Строса, семіётыка У. Эка, аўтара рэвалюцыйнай тэорыі кантанацыйнага пераасэнсавання традыцыйнай музыкі акадэміка І. Маціеўскага, псіхолага К. Г. Юнга, метафізіка Р. Генона, складальніка структуры фіна-ўгорскага эпасу «Калевала» Э. Лёнрата [4].

Можна прыйсці да высновы, што «Тэорыя…» як сінтэз фальклfavорыстыкі з культурнай антрапалогіяй з'яўляецца даведачна-аналітычным дапаможнікам для фалькларыста-практыка. Яна спалучае тэарэтычнае даследаванне і ўжытковую культуралогію ў мэтах захавання і адраджэння традыцыйнай культуры, што, паводле меркаванняў спецыялістаў, значная з'ява ў навуковай спадчыне прафесара Э. Дарашэвіча. Ён жа слушна канстатуе, што менавіта ў напрамку антрапалагічных даследаванняў [4, с. 6] сам час і яго рэаліі павольна пераарыентоўваюць этналагічныя, мастацтвазнаўчыя і культуралагічныя дасягненні сучасных навукоўцаў, а новы (антрапалагічны) напрамак у гуманітарыстыцы здольны значна палепшыць, сістэматызаваць і ўпарадкаваць дакладнае навукова абгрунтаванае разуменне ўсходнееўрапейцамі тыпалогіі ўласных культур.

*1.* Антология педагогической мысли Белорусской ССР / сост. : Э. К. Дорошевич, М. С. Мятельский, П. С. Солнцев ; редкол. : М. А. Лазарук (отв. ред.) [и др.] ; Акад. пед. наук СССР. – М. : Педагогика, 1986. – 460 с.

*2. Генон, Р.* Очерки о традиции и метафизике / Р. Генон ; пер. с фр. В. Ю. Быстрова. – СПб. : Азбука, 2000. – 320 с.

*3. Говард, М.* Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 478 с.

*4. Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Э. К. Дарашэвіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2016. – 78 с.

*5. Дорошевич, Э.* Очерк истории эстетической мысли Белоруссии / Э. Дорошевич, В. Конон. – М. : Искусство, 1972. – 320 с.

*6. Калацэй, В.* Ля вытокаў культуры. Міфалогія Беларусі: досвед структурнага аналізу / В. Калацэй // Культурная спадчына : культуралагічна-сацыялагічныя даследаванні / уклад., нав. рэд. і прадм. праф. Э. Дарашэвіча. – Мінск : Сучаснае слова, 2001. – С. 36–42.

*7. Конан, У.* Эстэтыка і паэтыка фальклору / У. Конан // Конан У. Выбранае / уклад. М. А. Козенкі. – Мінск : Смэлтак, 2009. – С. 470–531.

*8.* Культурная спадчына : культуралагічна-сацыялагічныя даследаванні / уклад., нав. рэд. і прадм. праф. Э. Дарашэвіча. – Мінск : Сучаснае слова, 2001. – 140 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
*10.* У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча / уклад. М. А. Козенкі. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2011. – 200 с. – (Серыя «Славутыя постаці Беларусі»).

*V. Kalatsei*

**Cultural and anthropological analysis of the Eastern European culture in the works of a prominent Belarusian researcher E. K. Doroshevich**

*The article describes a series of cultural publications prepared with the participation of Professor Engels Doroshevich. With these publications the Belarusian school of historical and philosophical studies actually marked several scientific research directions, which create conditions for comprehensive anthropological analysis of the genesis and typology of Belarusian and Eastern European culture.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 16.11.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ